УДК 338.2

# ШЛЯХІ ПАВЫШЭННЯ КАНКУРЭНЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СФЕРЫ

**Пабядзенка У. М.**, аспірант
Навуковы кіраўнік – Западнюк Я. А., к.э.н., дацэнт
каф. «Эканамічнай тэорыі і сусветнай эканомікі»
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны
г. Гомель, Рэспубліка Беларусь

Развіццё і распаўсюджванне інфармацыйных тэхналогій уносіць змены ў канкурэнтны механізм. Неабходна адрозніваць канкурэнтныя перавагі для кампаній, якія прымяняюць інфармацыйныя тэхналогіі і якія працуюць у рамках звычайнай вытворчасці.

У першым выпадку інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць аўтаматызаваць планаванне і ўлік у фірме. Вылучаюць наступныя канкурэнтныя перавагі ў сувязі з выкарыстаннем інфармацыйных сістэм: пашырэнне і паляпшэнне якасці працы за кошт эканоміі часу супрацоўнікаў, персаналізацыя, магчымасць атрымання дакладнай інфармацыі і прыняцця правільных кіраўнічых высноў [1, с. 201].

Асаблівасці дзейнасці ў інфармацыйным канкурэнтным асяроддзі: эканамічная дзейнасць суправаджаецца ростам, а не памяншэннем прыбытковасі; у інфармацыйным канкурэнтным асяроддзі павелічэнне аддачы ствараецца ўсімі ўдзельнікамі і размяркоўваецца ў ёй паміж усімі [2, с. 136]; законы попыту і прапановы не працуюць, таму, што многія нематэрыяльныя тавары ствараюцца вытворцамі і спажыўцамі сумесна; кампанія, якая стварае навукаёмістую прадукцыю, здольная атрымліваць прыбытак з-за знешніх эфектаў.

У найбольш поўным выглядзе канкурэнтная мадэль інфармацыйнай эканомікі апісана К. Шапіро і Х. Вэрыянам.

## Спіс літаратуры

1. Стюарт, Т. Интеллектуальный капитал. Новый источник богатства организаций / Т. Стюарт. – М.: Поколение, 2007. – 370 с.

2. Сорвиров, Б. В. Теория конкуренции: учебно-методический комплекс / Б. В. Сорвиров, А. М. Баранов, Е. А. Западнюк. – М.: Интеграция, 2011. – 221 с.